**«ЗБОР ПО́МНІКАЎ ГІСТО́РЫІ І КУЛЬТУ́РЫ БЕЛАРУ́СІ»**, шматтомнае даведачнае выданне. Выпушчана выд-вам «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П.Броўкі ў 1984—88 на бел. мове ў 7 тамах (8 кнігах). З'яўляецца часткай «Зводу помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР». Падрыхтавана супрацоўнікамі сектара збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, аддзела археалогіі Ін-та гісторыі АН Беларусі. Уключае больш за 14 тыс. артыкулаў пра нерухомыя помнікі (гісторыі, археалогіі, манумент. і манумент.-дэкар. мастацтва), якія захаваліся на тэр. Беларусі з часоў старажытнасці да 1980-х гг. і знаходзяцца або павінны знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Кожны том прысвечаны пэўнай вобласці, матэрыялы, якія датычацца Мінскай вобл., складаюць 2 кнігі. Асобная кніга распавядае пра помнікі г. Мінска. Артыкулы ў тамах размешчаны па раёнах (у алфавітным парадку). Кожны том мае імянны, геагр. і храналагічны (скла-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

даецца з наступных падраздзелаў: недатаваныя помнікі археалогіі, ранні феадальны перыяд, 11—13 ст., 13—17 ст., 18 ст., 19 ст., 1900—17, 1917—20, 1920—41, 1941—45, 1945—80-я гг.) паказальнікі. На пачатку кожнага тома змешчаны звесткі пра рэгіён (напр., Гомельская, Магілёўская вобласці), затым — пра яго абл. цэнтр. Унутры раздзелаў, прысвечаных асобным раёнам, спачатку даюцца звесткі аб раённым цэнтры, затым (у алфавітным парадку) — аб помніках інш. нас. пунктаў. Выданне змяшчае 131 карту, 6817 іл. У 1990 на рус. мове выдадзены дапоўнены і дапрацаваны том «Збору...» па Брэсцкай вобл. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова